БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру(
на апошняй —50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 70. Менск. Серада 19 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 19/VI.

«Гей верніся Сагайдачний!
...«Необачний!..»

Такімі слоумі прамауляе да сагайдачнага здаровы розум у песьні украінскага кобзара.

Абавязкам і павіласьцю беларускай прэссы да свайго роднага краю есьць бяз'упыннае паутарэнне гэтых слоу у стасунку да вышэй стаячых з Беларусі станау.

Наш Сагайдачны—вышэйшыя станы—дауно ужо праменялі «на тытун ды люльку» чужаземнага павярхоунага бляску сваю дзедзічнасьць у гэтым краі—права і абавязкі беларускаго грамадзянства.

Паслухайце гутаркі іх прадстаунікоу, паглядзіце на іх дзела, прышчырцеся да іх інтарэсау: усе яны ні тут, ні на роднай глебі, с каторай бярэцца хлеб, магчымасьць і права жыць і называцца належачымі да вышэйшых станау Беларусі, а недзе у далі, за роднымі рубяжамі і, найчасьцей, у тумані ні рэяльнай прошласьці. Жывучы на Беларусі, яны згубілі грунт пад сабой (апрача «грунтау») самі падсушылі свае карані і як ніпатрэбны у лесі сухастой вось-вось гатовы упасьць і так упасьць, што ніхто іх ні пашкадуе, а усе пастараюцца хутчэй пазбыць іх с памяці.

Настау час калі перад краем нашым, як перад краем, а ні нацыяй нават, узышла зорачка пракаючая лепшае чалавечае жыцце. Як расьліна с цемнай і вільготнай ямы цягнецца на сустрэч яснаму жыводаучаму слонейку, цягнецца н а р о д беларускі да свайго самаістнаго жыцця. У сэрцы яго будзе радасьць, што у канцы пазбавіуся такі цяжкаго прыгону па карысьць „братоу". Кожны чын грамадзкай дапамогі, кожная добрая рада, у гэтых варунках, с чыйго-б яны боку ні прыйшлі, залічацца ім, беларускім н а р о д а м, на векі вечныя, да дабрадзействау, яму калі небудзь зробленых, як дагэтуль жывуць іщча у яго памяці дабрадзействы Вітоута.

А яны? Што робяць яны нашыя вышэйшыя станы для свайго народу?

Ніобачныя! Яны стараюцца рабіць яму перашкоды, замест памагаць; яны як-бы нічога ні сталося, глядзяць цэлымі днямі на тыя збутвелыя малюнкі *XVII—XVIII* в. в., якія у іх памяці захаваліся і зачараваныя імі на увесь голас сьпяваюць «Gloria»! на хвалу мінулай і ніколі ніузваротнай прошласьці. Дым свайго тутуну яны цэняць даражэйшым, чым пульхны пірог, які прапануе ім гаспадыня.

Вот пытанне аб унівэрсытэці. У ва усіх колах грамадзянства ідзець гутарка аб ім. Што-ж мы чуем ад іх?—«Нашто нам унівэрсытэт, нашыя дзеці будуць ездзіць у Польскія», альбо, іншыя: «у расійскія»!

Вот выстаука стара-дрэуніх рэчау:—«ну якая-ж тут беларуская выстаука? Толькі есьць беларускаго, што мужыцкія паясы, а іншае усе с Польшчы»...

Цемень, цемень! Чаму ж за дымам люлькі сваей ты ні бачыш, што Беларусь і цябе с тваей ніверпасьцю, с тваім рэнэгэнтвом, с тваей... цемватой любіць і свэей лічыць? Нашто лішні раз абсекаеш ты свае шчупленькія кароценькія карані!?

— «Гей верніся Сагайдачний!»...

... «Необачний!»...

На беларускім шляху.

— **Народным сакратарствам Прасьветы** арганізаваны дзьве камісіі для перагляду і падгатавання падручнікаў для Беларускіх школаў. Адна займаецца падручнікамі для сярэдняй школы, а другая для ніжшай. У склад камісіяў увайшлі беларускія настаўнікі і найвыдатнейшыя сілы з расійскіх і польскіх школаў. Дзеля кароткасьці часу да пачатку школьнаго году ухвалено пакуль з укладаннем новых падручнікаў пераламыць на беларускую мову лепшыя з жываных у мейсцовых школах падручнікаў. Для гэтаго Народным Сакратарствам створэно асобнае Бюро для перакладаў.

— **Сакратарствам Прасьветы** арганізавана камісія для устройства Дзяржаўнаго Беларускаго Унівэрсытэту у Менску. 2 і 8 чэрвеня адбыліся 2 пасядзэнні Камісіі. На першым пасядзэнні разглядалося пытанне аб тыпу унівэрсытэта і магчымасьці яго адкрыцця у пачатку наступаючаго акадэмічнаго года. На другім пасядзэнні былі зроблены выбары прэзыдыуму Камісіі. Выбраны: маршалкам проф. Доўнар-Запольскі, таварышам маршалка проф. М. Массоніус. сэкрэтаром Э. Будзько. Выбар другога таварыша маршалка пакуль што адложаны. На томжа пасядзэнні пастаноўлено стварыць падкамісіі: фінансавую, па збору колекцыяў і арганізацыйную, у якія маюць быць запрошаны тутэйшыя грамадзкія і фінансавыя дзеячы.

— **Беларускі гандлевы абмен.** Абвешчэнне нізалежнасьці Украіны і Беларусі высунуло рад пытанняў аб рэгуляцыі гаспадарчых стасункаў паміж абаімі дзяржавамі. Клопат аб гэтых інтарэсах узяла на сябе на тэрыторыі Украіны спэцыяльная беларуская арганізацыя дзеля гандлёваго абмену. Устава яе зацьверджэна Беларускім Сэкрэтарыятам, дзеля чаго Палата будзе мець урадовы характар. У задання Палаты ўходзіць абарона гандлёвых інтарэсаў Беларусі і беларусаў на тэрыторыі Украіны, зьбіранне ведамасьцяў якія пашыралі-бы і рэгулявалі-б гандлёвыя стасункі. Яна мае і практычныя задання, бо прыймае замаўлення на дастаўку тавароў, раздзеляе іх паміж спажывачамі і г. і. У склад Палаты увайшлі прэдстаўнікі навукі і тэхнікі (проф. Доўнар-Запольскі, пр. пав. Базарэвіч, іяжынэры Головінскі і Тэрэпэцкі) грамадзкія дзеячы (Бурчак і нікат. інш.) і гандлю [Загорскі, Вавула].

Гандаль з Нямеччынай. Пад назвай «Balticshe Handelsgelschaft» у Кенігзбэргу асновалося таварыство для гандлёвых зносін паміж усходнімі Прусамі і Беларуска-Літоўскім краем, асабліва для гандлю будоўляным мэтэр'ялам і дрыўмі. Так само яно мае займацца рэчным параходствам.

«Б. Э.»

Агульныя весткі.

БЭРН. 14/VI. (афіцыяльная). Дзействіямі нашых падводных лодак зноў патоплено 20000 тонн, брутто. Глаўнае участье у гэтых усьпехах—каля 17 тысяч тонн,—прыймаў капітан Гэорг, глаўным чынам усьпеваючы у Ламаншскім канале. Паміж іншым знішчаны два поўна напакованых таварных параходы прыблізіцельна у 4—6000 тонн, а так сама адзін наліўной параход тыпа «Луцеллум» прыблізіцельно у 5000 тонн, плыўшы пры праваджэнні двух вялікіх контр-субмарын. Апрача таго, з находзячагося у ангэльскай ваеннай службе рыбачаго карабля «Сэр Джон» захоплены гарматы і ваенны штандар, а камэндант, машыніст і адзін матрос ўзяты у палон.

Начальнік Морскаго Штаба.

ЖЭНЭВА. 15/VI. Згодна павядамленню «Коррыерэ дэлла Сэра», у Абіссініі пачалалася новая рэвалюцыя. Прыхільнікі Лідаша Ікассуса на поўначы вельмі павялічываюцца.

АМСТЭРДАМ, 13/VI. Па весткам газэты «Альзэмэйн Гандэльсблад», ангельскі канцлер скарбніцы у аўторак ўнёс у ніжнюю палату прэпонанні аб адпуску крэдытаў у 500 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Агульная сумма адпушчанных за час вайны крэдытаў, уключаючы і гэты новы крэдыт ёсьць 7,342 мільёны фунтаў стэрлінгаў.

ЛЕНДАН, 15/VI. У Баллігары (Ірляндзія) у часе арэштау двох служачых з каланіяльных магазінаў выйшлі стычкі паміж паліцыяй і насоленнем. Перад паліцэйскай казармай натоўп веў сябе так шумна, што прыказано было пусьціць у ход дубінкі. Узбураная публіка пачала закідываць гарадавікоў каменямі і тухлымі яйцамі. Вядучыя у место вуліцы былі забарыкадаваны пнямі дроў і калючым дротам. У часе транспорта палонных у турму, паміж публікай і паліцыяй выйшлі новыя стычкі. Пасьля таго, як паліцыя са сваімі дубінкамі аказалася безпомачнай проціў натоўпу, ей прыказана былоісьці у штыкі. Ранено ўсяго 6 чалавек.

АМСТЭРДАМ, 15/VI. Рэйтэр паведамляе афіцыяльна з Токіо: С прычын беспарадкаў у Сваатаў, Квантунской правінцыі, там былі высаджэны японскія марскія салдаты.

— Армейская група Эйхгорна апублікавала сягоння вось якую тэлеграмму на імя генэрал - фэльдмаршала фон-Эйхгорна:

«Паведамляю Вашаму Прэвасхадзіцельству аб новым вялікім усьпеху ўвераных мне войск к захаду ад Таганрога. Мае батальёны, эскадроны і батарэі амаль зьнішчылі большэвіцкую чырвоную армію, каторая наступаючы ад 10-го чэрвеня з Ейска пад начальствам чэшскага афіцэра, у ліку 10000 чалавек, высадзілася на берагі Азоўскаго мора і пачала нападзенне на Таганрог. Падлічано вышэй 3000 забітых большэвіцкіх чырвонагвардзейцаў, ні лічучы тых, каторыя згінулі у моры. Нашы страты ні вялікія.

Генэрал Кнерцэр.»

Польшча і коаліцыя.

З даручэння польскаго Прэзэса Міністраў «Monitor Polski» надрукаваў у урадовым аддзелі гэтакае:

«Подлуг урадоваго паведамлення агэнцтва «Гавас» ад 3 чэрвеня г.г. у Вэрсалі, на зьезді прэзэсаў міністраў Францыі, Англі і Італіі была прынята такая рэзолюцыя: «Стварэнне ядынаго, нізалежнаго Польскаго Панства з вольным доступам да мора ёсьць адным з варункаў трывалаго і справядліваго міру і панавання законнасьці у Эўропе».

Ні ўходзячы у ацэнку са-

мой рэзолюцыі, польскі урад ні можа ні зьвярнуць увагі на квілю і акалічнасьці пасярод якіх яна прынята. Прыпамінае яна нам тыя залішне балючыя хвілі, калі, тольki пасьля таго, як рускія войскі пакінулі Каралеўство, царскі урад рашыўся прыступіць да рэялізацыі нікаторых правоў, аб якіх больш веку мы дарэмна упаміналіся. Ні самы зьмест, знача, рэзолюцыі, але момант яе ухвалення прыдае ёй асобны характэр.

Дзеля таго урад Польшчы, сягаючы ніухільно да стварэння Польскай дзэржавы, маючай патрэбныя варункі для палітычнаго, культурнаго, і эканамічнаго развіцця краю, с цэлым народам, ні дасца выбіцца з роўновагі вэрсальскай рэволюцыяй і ні ўважаючы на усялякія труднасьці і перашкоды, будзе ніухільна ісьці да зьнішчэння грунтоўных постулятаў народу, каторыя зробяць магчымым споўненне на ўсходзе Эўропы яго гісторычных задач, ў супольнай працы с цэнтральнымі дзэржавамі. Гэта вымагаецца цьвяровай ацэнкай нашых уласных інтарэсаў, каторыя толькі адны ёсьць для нас крытэрыям».

Бяседа с членам магістрату яг. Цывінскім.

Наш супрацоўнік 17 чэрвеня бяседаваў с членам магістрату п. Цывінскім па розным пытанням, на якія апошні прыхьнена павядоміў вось што:

Раней,—казаў п. Цывінскі—я служыў начальнікам жалезнадарожнай дыстанцыі у Сыбіры, апошняе дзесяцілецце—у мейсцовым самаураўленні.

Заданні магістрата, па маёму, павінны сходзіцца к таму жа, што і у выбарнай установі меськ. думе, к прагрэсуючаму добрабыту места па захадна-эўрапэйскім, памажлівасьці, прыкладам, с дaглядом як мага ва усім эканоміі, пры чым без ўсякай палітычнай і нацыянальнай розні пры разрашэнні будучай радай давераных пытанняў меськай гаспадаркі. Тут палітыка ні пры чым, і эканомічнае палепшэнне места павінно ісьці ні рэвалюцыйным, як у большэвікоў, у якіх нават Кропоткін, і Плеханоў папалі у лік «рэтроградоў», а толькі эволюцыйным пуцём.

У б. меськ. думе параджаліся праэкты, адзін аднаго пяйней, гарамі і пірамідамі, але, шкадуем, вельмі німногім з іх суджано было увайсьці у жыццё, дзеля браку, глаўным чынам, кемкасьці, сыстэмы досьвядчэння і грошай.

Затое кідаліся вялікія асігноўкі на стварэнне усё новых дорага каштуючых штатаў, камісіяў, падкамісіяў і розных пасад, давеўшых выдаткі па гэтай стацці да $^1/_2$ мільёна у месяц.

Асобіста у маім аддзелі.—аб якіх страіцельных заціях і плянах цяпер, далей, да адраджэння фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў у краю, ні можа быць і гутаркі, калі 1 кв. сажэнь бруку «таксіруецца« цяпер 1100 р., замест стаўкі спакойнаго часу—30 р. сажэнь; 1 кв. сажэнь даку абходзіцца—60 р. замест ранейшых—4—5 р. і г. д.

Аб гатунковай старане рады давераных гаварыць ні магу, дзеля таго што ні маю данных па гэтаму пункту, так сама мне нічога нівядома а становішчы спраў ў дэпартамэнтах маіх коллег—Каплана, Нэйфаха і др. Мы адзін за аднаго нізалежны і кожны з нас заняты сваёй справай.

І вось. кепска адклікаючыся а партыйнасьці, ўнасімай у жывую муніцыпальную справу б. думай, мы атрымалі ад яе спатчыну ні з важных, глаўнае па фінансавай часьці.

Цяжка і балюча было бачыць, як б. дума увесь час выдавала на пэнсію служачым і на другія патрэбы «позаимствованія» (па 200—300 тысяч рублёў) у меськ. харч. камітэту, прымушаючы гэтым і яго на урэзкі па часьці асігновакпа справу велікшую—харчы места. Зьменьшэнне штатаў будзе частычна і у маім аддзелі.

Па пытанню аб сучасным становішчы Беларусі і яе будучай долі, я скажу, што ішчэ 25 гадоў таму назад у званні бібліатэкара беларускай Пецярбурскай бібліотэкі я стаяў за дзержаўна палітычную нізалежнасьць Беларусі, як цэльнаі, я па суці беларус-паляк, на гэтым групці меў німало ніпрыемнасьцей сярод мейсцовай польскай інтэлігэнцыі, але ніколі ні выйду з усвоенаго мною погляду.

И. В.

З дарогі.

(Беларусы на р. Дзісьне.)

Праежджаючы с Чарнігаве уверх па Дзісьне пад Новазыбкаў і Бранск, вы спатыкаецеся з знаемымі вам абліччамі беларусаў, захаваўшымі тамака свае прызвычаення, абраднасьць, мову, нацыянальныя асобнасьці у вопратцы й узаемных стасунках.

Вось перад вамі хаты беларускай архітэктуры, пабудаваныя з векавых хвояў, накрытыя саломай па камель абгароджаныя платамі і частаколам.

Пекна наложаны вескі у маляўнічых, лясістых закутках Чарнігаушчыны, спакойна і дружна жывуць паміж сабой і шчыра упраўляюць свае нівялічкія участкі.

Летась у гэтыя вескі давeдываліся прэдстаўнікі беларускаго нацыянальнаго руху і паусюдах мелі ласкавы прыем і чулі ад старых і малых на роднай мове старую беларускую песьню:

„Чаму-ж мне ні пець,
Чаму-ж ні гудзець,
Калі у маей хатанцэ парадак ідзець?"

І сапрауды, на Чарнігаушчыне, у беларускіх яе паветах ні было тых жудасных пагромаў маенткаў і крывавай разьні, якія былі у другіх мейсцах.

У абецны час у Чарнігаве істнуе Нацыянальны беларускі гурток, злучыўшы у месьце і павеце беларусаў тубыльцаў і уцекачоў з Гродзеншчыны. У Новазыбкаускім, Старадубскім, Імглінскім і Суражскім паветах нацыянальны р/х паволі расьцець і беларускія народныя камітэты закладаюць стасункі з Беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі м. Гомля.

Н. Жук.
(„Бѣл. Эхо".)

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Яго эсцэленцыя біскуп Лозінскі, які пераехаў ужо праз Дзьвінск для консэкрацыі у Варшаву, мае прыбыць у Менск, для заняцця Менскаго Р.-К. Епархіату, 2 ліпня. Тутэйшым каталіцкім насяленнем біскупу гатуецца урочыстае спатканне.

У магазінай службе Л. Р. ж. д. пачато злучэнне з яе упрауленскім штатам прыбыўшых з Віленскаго абласнога упраўлення № 5 нямецкіх жалезнадарожных агэнтаў, з мэты наладжывання справы.

Часьць стараго штата магазіннай службы, ні вельмі патрэбная, будзе зьменшана.

Рэквізавано у цэнтральнай часьці места для чынаў прыбываючага штаба X арміі памешканняў на 800 чал.

Праэкт павялічэння прычта перэспенскай кладбішчэнскай цэркві ні пасьпеваючаго абслужываць усе трэбы, глаўнае пагрэбальныя, раскалоў парахвіян і парахвіянскую цэркоўную раду на два лагэры: адзін (рада) выстаўляе кандыдатам на пост сьвяшчэніка Кіркевіча (павятоваго даглядчыка ц. прых. школ), другі—парахвіяне выстаўляюць ваеннаго сьвяшчэніка Вішнеўскаго.

Настаяцель, цэркві а. Флероў процiў павялічэння прычта.

Спрэчка пераходзіць на разгляд епархіяльнай уласьці.

У губ. земстве камічнае абяднение кассы (125 руб. усіх грошай) пабудзіло камандзіраваць бухгалтэра у Пецярбург і Маскву дзеля перагавораў с большэвіцкімі главарамі аб зварoце захопленых пры уцеках з Менску земскіх сумм.

Покуль што на гэта адказываюць аднымі толькі абецанкамі—цацанкамі.

А між тым 10-го чэрвеня служачым зноў німа чым пэнсіі заплаціць.

У камісіі па аналу экстрэная рэвізія, па загаду гэрманскіх уласьцей, ужо наткнулась на вялікія нідачоты у бухгальтэрыі: бракуе шмат грошавых апраўдацельных дакумэнтаў.

Чакаюць вялікіх сурпрызаў і адкрыццяў.

Член камісіі Левітас яшчэ перад рэвізіяй пастараўся екопанасьціжка выехаць з Менску.

Паверачная рэгістрацыя салдат у воінскаго начальніка прадаўжаецца, болей усяго адзіночкі с толькі што прыбываючых у Менск.

У вольна-пажарным таварыстве паднято пытанне аб аблажэнні насялення, дзеля павялічэння грошай т-ва, новым пажарным налогам.

Меськае самаупрауленне і гэрманскія уласьці адносюцца да гэтаго пачынання адабрыцельна.

Аб узносе самастаяцельнаго падаходнаго налогу самаупрауленне напамінае, што апошні срок яго—1-е ліпня, пасьля чаго штраф да 50 руб.

У меськай кассе пустата прадаўжаецца.

20 числа выплаціць служачым пэнсіі за чэрвень німа чым.

Нараб X (упрауленне начальніка дарожных работ б. X арміі) эвакуавано у Воронеж адкуль і запрашывае да сябе на службу з Менску б. служачых і рабочых X арміі.

Надоразап (упрауленне дарож. работ армій б. заходнаго фронту) перанесено у Пэнзу, адкуль так сама кліча да сябе з Менску служачых.

Конны рынак у панядзелак, 17 чэрвеня, ні выдаючыся лікам каней, выдауся затое цэнамі:

Чуць жывая клячонка — —600 руб.
сярэдняй рукі 1000 руб.
лепшая — — 1500 руб. і болей.

У т-ве сельскай гаспадаркі 15, 16 і 17-го чэрвеня на адбыушымся гадавым сходзе членаў старшыней т-ва выбраны ранейшы — Войніловіч. таварышам—Л. Лубенскі, членамі—В. Ваньковіч, Р. Скірмунт, Ю. Кологрываў і М. Ястржэмбскі.

Рэшано, дзеля барацьбы са спэкулянтнай дзеяльнасьцю разнаго роду «лесапрамышленікаў», устанавіць кампанію з землеуласьнікаў па інтэнсыўнай лесаапрацоўцы у губэрні.

З вестак з мейсц выяўляецца, што у большасьці маенткаў абсеянне зроблено сваечасна, выключаючы прыфронтавы рубеж дзе адчувауся вялікі нідастатак насення.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 17 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Усіленная разведачная дзеяльнасьць, выклікала пяхотныя баі у многіх мейсцах фронта: Паўднёва-заходняй Іпэрна і па абодвым бакам Соммы баевая дзеяльнасьць ажывілася к вечару. Паўднёва-заходняй Нуайона артылерыйская дзеяльнасьць к вечару ўзмацавалася. Паміж Урсай і Марнай мы ўзялі палонных пры мейсцовых прэдпрыемствах.

Пры нашым націску между Мондызье і Нуайонам лік ўзятых гарматаў павялічыўся ад 150 да 300 і глаўным чынам вялікаго калібру. Лік кулямётаў—шмат болей 1000.

Група арміяў Гальвіца.

Меж Маас і Мозэль мы нанеслі вялікія страты амэрыканцам на абедзьвым старонам Ксіврэ і зруйнавалі часьці іх ўзмацаванняў.

Группа арміяў Гэрцога Альбрэхта.

Разведчыкі прывялі палонных у Вогэзах і Зунэргад з французкіх і амэрыканскіх акопаў.

Учора намі зьбіты 7 самалётаў і 8 прывязных шароў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

К апрацоўцы губ. зямельным камітэтам аграрнай рэформы сельско-гаспад. т-во адносіцца скептычна.

Сход названнаго т-ва быў многалюдны—участвавало да 120 чалавек.

Польская бібліотэка. Як піша «Минскій Еженедѣльникъ», бібліотэка менскай польскай «Мацежы» збагацела вельмі дарагім сабраннем кніг і рукапісаў у польскай мове, атрыманымі с пазвалення акупацыйных уласьцей са складу бібліотэкі б. мужчынскай клясычнай гімназіі. У ліку гэтых кніг есьць вялікай вартасьці унікумы друку 16 і 17 сталецціяў. Вялікая праца па адбіранню кніг і прывядзенню іх да парадку зроблена поўнамоцным польскай рады зямлі менскай П. А. Шумовічэм. Лік атрыманых кніг даходзіць да 1300.

Весткі с краю.

Орша. «ПетроградскійГолосъ» № 79 прыводзіць вось якія ўражэнні паездкі з Расіі у занятыя гэрманцамі вобласьці: Мы ехалі праз Оршу. Па дарозе мы праезжалі каля ніабработаных нізасеяных палеў Расіі, каля брудных станцыяў і мы спатыкалі ўсюды, куды-б ні глянулі, абразы поўнай руіны. У праціўнасьць гэтаму у занятых гэрманцамі вобласьцях ад Оршы раней ўсяго кідаюцца у вочы добра абработаныя паля, добры від жыта і ва усім поўны парадак. Так сама і на станцыях парадак і чыстата.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.